***В. Л. Гуцько,***
*дацэнт кафедры рэжысуры абрадаў*
*і свят, кандыдат культуралогіі*

# ЖАНОЧАЯ ЛІРЫКА НА БЕЛАРУСІ: ТЭНДЭНЦЫІ ЭМАНСІПАЦЫІ І САМАЎСВЕДАМЛЕННЯ

Жаночая лірыка не была распаўсюджанай з'явай ў сусветнай культуры да пачатку XX ст. Уздым руху жаночай паэзіі пачынаецца з наступлення складанага палітычнага становішча ў свеце, Першай сусветнай вайны, калі жанчына ўспрымаецца адасоблена ад сямейных роляў і пачынае больш дзейсна выконваць сацыяльныя ролі ў грамадстве. Менавіта ў азначаны час з'яўляюцца новыя накірункі паэзіі, якія дазваляюць таленавітым паэткам стаць упоравень з паэзіяй мужчын.

Жаночая паэзія своеасаблівая ў кожнай нацыянальнай літаратуры. Гэта тычыцца перш за ўсё больш тонкага адчування свету, якое не характэрна для мужчын. Жанчына ў залежнасці ад свайго характару можа змяняць і адыходзіць ад стандарту, які прапанавалі. Мы разгледзім паэтычную творчасць чатырох аўтараў – Эдзі Агняцвет, Яўгеніі Янішчыц, Раісы Баравіковай і Ірыны Багдановіч. На прыкладзе іх работ паспрабуем знайсці агульнае і адметнае, што характарызуе іх як творцаў. Біяграфіі паэтак дапамагаюць у разуменні іх светаўспрыняцця, творчых памкненняў.

Эдзі Агняцвет (сапраўднае прозвішча – Каган) нарадзілася 11 кастрычніка 1913 г. у горадзе Менску ў сям'і служачых. Скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратуранага факультэта Менскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1934). Выдала шмат кніг дзіцячай паэзіі на беларускай мове. Творчасць Э. Агняцвет была прызнана на сусветнай арэне. За кнігу вершаў і перакладаў для дзяцей «На двары алімпіяда» паэтка ў 1986 г. была ўзнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х. К. Андэрсена [7].

Біяграфія Раісы Баравіковай нагадвае жыццёвы шлях Эдзі Агняцвет. Асноўнай прафесійнай дзейнасцю абедзвюх паэтак была выбрана літаратурная работа. Р. Баравікова нарадзілася 11 мая 1947 г. у весцы Пешкі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачага. Скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута ў Маскве (1971). Дэбютавала ў друку ў 1960 г. Ёю апублікаваны шэраг паэтычных зборнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць Раісы Баравіковай прызнана на ўзроўні краіны, паэтка ў 1993 г. атрымала Дзяржаўную прэмію Беларусі [6].

Творчая праца і прафесійная кар'ера Яўгеніі Янішчыц складваліся ўдала, у адрозненні ад яе сямейных зносін. Яна была адзінокай, выхоўвала сына. Магчыма, такая акалічнасць паслужыла прычынай таго, што на піку творчага ўздыму яна трагічна абарвала сваё жыццё ў сорак год. Яўгенія Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 г. у вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і [9]. З юных год стала гонарам школы і сваёй «малой радзімы». Пасля заканчэння адзінаццаці класаў з лёгкасцю паступіла на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры БДУ (1966). Аўтар шматлікіх вершаваных зборнікаў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978) за кнігу лірыкі «Дзень вечаровы» (1974), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1986) за кнігу лірыкі «Пара любові і жалю» (1983).

Адна з сучасных жаночых асоб у беларускай лірыцы – Ірына Багдановіч. Паэтка нарадзілася 30 красавіка 1956 г. у горадзе Лідзе Гродзенскай вобласці ў сям'і служачых. Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1978) [3]. Кандыдат філалагічных навук. Аўтар зборнікаў паэзіі для дзяцей і дарослых. Выступае як крытык, літаратуразнавец. У 1989 г. выйшла манаграфія «Янка Купала і рамантызм», у 2001 г. – «Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння» [2].

Прафесійная кар'ера паэтак ажыццяўлялася паспяхова, іх творчыя дасягненні былі прызнаны айчыннай крытыкай, міжнароднай супольнасцю. Падрабязны разгляд творчасці паэтак схіляе да думкі, што лірычныя творы ствараліся не на ўздыме шчасця, а ў адваротным выпадку, калі ўсё прайшло, адзвінела, адгаварыла. Таму творчы шлях лірычнай дамы – гэта ціхія слёзы, якія ў паэтак узнікаюць з-за нераўнавагі існавання і жадання спраўдзіць летуценні.

Звернемся да вызначэння тэматыкі ў творчасці кожнай паэткі, прадстаўленай у нашым даследаванні. Паэзія Э. Агняцвет адзначаецца лагічнай завершанасцю, паслядоўнасцю. Пачуццё кахання разлядаецца паэткай з пазіцыі часу, адлегласці, філасофскага атаясамлення. Каханне ў вершах Э. Агняцвет – гэта катэгорыя ўсеагульнай любові да бацькоў, дзяцей, моладзі, прыродных з'яў, паўсядзённых рэчаў. Тэма інтымнай лірыкі застаецца хвалюючай і ў сталых вершах паэткі як успамін аб маладосці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Шматлікія вершы змяшчаюць ваенную тэматыку і спадзяванні на ўзнаўленне жыцця пасля вайны. Можна адзначыць, што ў лірыцы Э. Агняцвет прысутнічае эмацыянальна значны вобраз вяртання дадому ва ўспамінах, снах. У падтэксце вершаў скразіць туга і шкадаванне аб мінулым дзяцінстве.

Тэматыка лірыкі Р. Баравіковай [5] перанасычана пачуццём непадзеленага кахання. Можна быць упэўненымі, што для паэткі важна не прасіць быць каханай, а самой кахаць. І жанчына ў поўнай меры аддаецца гэтаму пачуццю. Усе вершы ў зборніку раскрываюць закаханасць, неспакой, трывогу, боль па страчаным каханні і сум успамінаў аб мінулым шчасці. Адна з распаўсюджаных тэм беларускай літаратуры – вяртанне ва ўспамінах да роднай хаты – разглядаецца ў паэзіі Р. Баравіковай. Шмат вобразаў, навеяных дзяцінствам, набываюць акрэсленую форму ў сталым ўзросце і пераасэнсоўваюцца.

Лірычная постаць Я. Янішчыц [8] у вершаваных творах кіруецца ўспамінамі аб малой радзіме, раскрываючы неабсяжны сусвет паляшуцкіх краявідаў. Падчас аналізу вершаў мы разумеем, што вялікае ў малым – не трэба шмат ведаць, каб зрабіць слушныя высновы; не варта шмат падарожнічаць па зямлі, каб зразумець прызначэнне чалавечага існавання. Адзін з такіх цудоўных прыкладаў – твор «Чытаючы пісьмо». Я. Янішчыц ўздымае праблему таго, што перапоўненыя людзьмі гарады не нясуць шчасця чалавечаму існаванню. Наадварот, чалавек у гарадскім натоўпе адчувае сябе астаўленым, безабаронным і тлумным. Творы перапоўнены вобразамі болю і шкадавання па страчаным каханні. Сустракаецца сярод вершаў паэткі тэма вяртання да роднай хаты. Асобнае месца ў творчасці займае зварот да сына. Паэзія Я. Янішчыц адзначаецца напеўнасцю і лёгкім рытмам, які патрабуе чытаня ўслых і памкнёнага эмацыянальнага ўздыму. Вершы напоўнены святлом і цеплынёй да роднага краю, адлюстроўваюць цікавасць і непаўторнае светасузіранне паэткі.

Агляд творчасці беларускай паэткі І. Багдановіч [4] паказвае, што амаль у кожным вершы адчуваецца зварот да каханага чалавека. І нават думкі аб знешніх абставінах існавання ўсё роўна выкліканы тэмай пошуку шчасця, якое заўсёды хаваецца ад рэчаіснасці. Тэма растання – гэта вынік імгненнага шчасця, за якое расплачваюцца людзі пакутлівай адзінотай. Аналіз лірычных тэкстаў І. Багдановіч выявіў частую тэматыку падарожжа па Вільні, якое хвалюе аўтарку. Шмат вершаў прысвечана гісторыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусі ў архітэктурных помніках («Полацкай Сафіі»), значных мясцінах («Няміга», «Стары млын») і, безумоўна, выбітных асобах («Купала, 1918 год», «Памяці Сяргея Астрэйкі», «У вянок Каміле Марцінкевіч»). І. Багдановіч раскрывае новы бок звароту да раскіданага гнязда продкаў. Для яе вобраз «раскіданага гнязда» – гэта мінулыя трагічныя падзеі на беларускіх землях, якія адбываліся у XVI–XIX стст. Для аўтаркі гэта асноўныя матывы, якія далучаюць яе, як сведку падзей, да ходу гісторыі.

Па заканчэнні падвядзем вынікі герменэўтычнага аналізу асаблівасцей жаночай лірыкі ў беларускай літаратуры на прыкладзе разгляду творчасці Эдзі Агняцвет, Раісы Баравіковай, Яўгеніі Янішчыц і Ірыны Багдановіч. Нашыя высновы грунтуюцца на некалькіх акалічнасцях:

– уздым жаночай лірыкі адбываецца ў XX ст. па ўсім свеце. Жанчыны атрымалі свабоду ў выбары любімай справы, набыцці незалежнага эканамічнага становішча і дасягненні сацыяльнага статусу ці дзейнасці, якія яны імкнуліся ўвасобіць. Кіруючыся разгледжанымі прынцыпамі, беларускія паэткі набылі адносную незалежнасць, якая найбольш удала раскрылася ў прафесійнай і творчай дзейнасці. Тым самым, жанчыны вызначалі сябе праз ролю творцы і грамадскага дзеяча;

– тэматыка вершаваных твораў змяшчае набалелыя для кожнай жанчыны пытанні паўсядзеннай рэчаіснасці – сваіх і чужых дзяцей, каханых, штучнага і навакольнага асяроддзя (мастацкіх карцін, музыкі, значных гістарычных мясцін, помнікаў і гарадоў, якія паэткі бачылі сваімі вачыма падчас падарожжаў);

– адна з самых распаўсюжаных і эмацыянальна ўзмоцненых праблем, якая ўздымаецца ў творчасці паэтак, – гэта сімвалічны зварот да бацькоўскага дому. Вобраз «раскіданага гнязда», напрыклад, у творчым пошуку І. Багдановіч атаясамляецца з мінулым Беларусі;

– сусвет жанчыны, які раскрываецца ў творах, перапоўнены святлом любові і кахання, гэтым пачуццём пранізана ўся рэчаіснасць. Вершы інтымнай лірыкі раскрываюць асэнсаванне і наканаванасць лёсу кахання – хуткі і імгенны парыў захаплення і доўгі, пакутлівы адбітак часу перажыванняў, якія суправаджаюць жанчыну надалей. Гэта сімвалізуе шчасце і горыч перамогі, якія жанчына атрымала падчас самаўсведамлення сябе як роўні мужчыне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Агняцвет, Э.* Закаханым : вершы / Э. Агняцвет / прадм. А. Вольскага. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 222 с.
2. Багдановіч Ірына Эрнстаўна // Асабістыя старонкі сяброў СБП [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://lit-bel.org/by/friends/b/149.html. – Дата доступу : 16.11.2014.
3. Багдановіч Ірына. Біяграфія // Слово [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://slovo.ws/bio/bel/02/0003.html. – Дата доступу : 16.11.2014.
4. *Багдановіч, І. Э.* Фрэскі : вершы і паэмы / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 118 с.
5. *Баравікова, Р. А.* Пад небам першага спаткання : лірыка / Р. А. Баравікова. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 174 с.
6. Баравікова Раіса Андрэеўна // Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http: // be.wikipedia.org/wiki/Раіса_Андрэеўна_Баравікова. – Дата доступу: 16.11.2014.
7. Біяграфія. Эдзі Агняцвет // Нацыянальны паэтычны партал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.vershy.ru/bio/ biyagrafiya-edzi-agnyatsvet. – Дата доступу: 16.11.2014.
8. *Янішчыц, Я. І.* Выбранае / Я. І. Янішчыц / Уклад. А. Канапелькі і В. Коўтун ; прадм. Дз. Бугаёва. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 351 с.
9. Янішчыц Яўгенія. Біяграфія // Слово [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://slovo.ws/bio/bel/25/0009.html. – Дата доступу : 16.11.2014.

***Н. И. Дожина,***
*заведующий кафедрой теории музыки*
*и музыкального образования,*
*кандидат искусствоведения, доцент*

# ЖАНРЫ ТАНЦЕВАЛЬНОЙ МУЗЫКИ В ИСТОРИИ И СОВРЕМЕННОСТИ

*Искусство танца началось тогда,*
*Когда первейшие основы мирозданья –*
*Земля и воздух, пламя и вода –*
*Любви, владычицы природы, вняли настоянью*
*И согласились, распри позабыв,*
*В коловращеньи танца ритм блюсти и меру,*
*Дабы весь мир их следовал примеру.*
***Джон Дэвис. Поэма «Орхестра»***
***(рубеж XVI–XVII вв.)***

В традиционной классификации музыкальных жанров, согласно которой они делятся на первичные и вторичные, именно

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ